

## На пенсію па новых правілах
СТАР. 4



## Нашы дзяўчаты вакол свету
СТАР. 7



## Як юбілеі класікаў святкаваць будзем
СТАР. 8-9

Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
27 СНЕЖНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 250 (28360)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# З САДУ — У САДОК


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Муж і жонка Мікалай і Юлія НІЧЫПАР з вёскі Гарадзец Ушацкага раёна сёлета атрымалі добры ўраджай яблыкаў. Цяпер яны ахвотна дзеляцца сакавітай садавінай з дзіцячым садком, які знаходзіцца ў суседняй вёсцы Ільюшына.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:**

*«Вельмі важнае пытанне — гэта звароты грамадзян. Яму трэба надаваць самую сур'ёзную ўвагу. Гэта ненармальна, калі людзі звяртаюцца ў Адміністрацыю Прэзідэнта, а потым гэтыя пытанні адпраўляюцца для разгляду тым, на каго па сутнасці справы і была скарга. Вядома, трэба дэталёва і больш глыбока аналізаваць звароты грамадзян, якія паступаюць у Адміністрацыю. Значыць, ёсць нейкія недапрацоўкі на месцах, якія трэба было б аператыўна вырашаць у рэгіёнах, у тым ці іншым міністэрстве і ведамстве».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9434 | ▼ |
| Еўра | 2,0378 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0319 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0736 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ВОЗЬМЕМ ВАШ БОЛЬ


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Учора беларусы дзялілі з расіянамі жалобу па загінулых у авіякатастрофе над Чорным морам. Па даручэнні Прэзідэнта нашай краіны былі прыспушчаны сцягі на дзяржаўных установах, паўсюль увечары не гарэла святочная ілюмінацыя, была абмежаваная трансляцыя забаўляльных тэлепраграм. А да Пасольства Расіі ў Мінску цэлы дзень людзі неслі кветкі і лампадкі, арганізацыі паадмаўляліся ў гэты дзень ад правядзення навагодніх карпаратываў. Бо нельга весяліцца, калі плача той, хто побач. Нельга не спачуваць, калі блізкім людзям балюча. Нездарма ж кажуць, што сябар пазнаецца ў бядзе. Менавіта тады, калі здараецца такое вось — нечаканае, страшнае, непапраўнае, адыходзяць на другі план усе дробныя крыўды і непаразуменні. Застаецца толькі людское гора і здольнасць або няздольнасць яму спачуваць. Гэткі просты, але самы правільны экзамен на чалавечнасць.**

СТАР. 2

■ Год навукі

# КЕКС «ШАХЦЁРСКІ»,
## або «Карысны» хлеб для здароўя

**Набываючы ў краме прадукты, далёка не кожны ведае, што многія з іх можна без перабольшання назваць навуковымі распрацоўкамі. Сярод інстытутаў Нацыянальнай акадэміі навук важнае месца адводзіцца ўстановам, якія займаюцца праблемамі здаровага харчавання. Іх прадукцыя адрозніваецца ад іншай тым, што ўсе вырабы праходзяць спецыяльныя даследаванні, падчас якіх пацвярджаецца іх станоўчы ўплыў на арганізм.**

Паводле слоў **намесніка генеральнага дырэктара па стандартызацыі і якасці прадуктаў харчавання Навукова-практычнага цэнтра па харчаванні Алены МАРГУНОВАЙ**, вектар развіцця харчовай прамысловасці ў Беларусі ўсё больш адхіляецца ад прынцыпаў здаровага харчавання. Таму цяпер наспела неабходнасць фарміравання такіх умоў, калі камерцыйная эфектыўнасць прадпрыемстваў будзе залежаць ад вытворчасці прадукцыі высокай якасці.

— Супрацоўнікі нашага навукова-практычнага цэнтра распрацавалі больш за 200 відаў кансерваў для дзіцячага харчавання на плодаагародніннай аснове, — адзначыла Алена Маргунова. — На фабрыцы «Спартак» арганізавана вытворчасць кандытарскіх вырабаў з вітамінамі і мінераламі для дашкольнікаў і школьнікаў. Распрацаваны маянэз «Школьны» для харчавання падлеткаў, ласункі для дзяцей, хворых на цэліякію і фенілкетанурыю.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Вы яшчэ паспяваеце выпісаць «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!